# Унесены змяненні і дапаўненні ў правілы аказання паслуг электрасувязі і пералік адміністрацыйных працэдур

22 жніўня 2016 г. пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 662 унесены змены і дапаўненні ў Правілы аказання паслуг электрасувязі, зацверджаныя пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 17 жніўня 2006 г. № 1055, і ў адзіны пералік адміністрацыйных працэдур, якія ажыццяўляюцца дзяржаўнымі органамі і іншымі арганізацыямі ў адносінах да юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, зацверджаны пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 17 лютага 2012 г. № 156.

У мэтах выканання Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 15 сакавіка 2016 года №98 «Аб удасканаленні парадку перадачы паведамленняў электрасувязі», які прадугледжвае стварэнне ў Рэспубліцы Беларусь нацыянальнай сістэмы супрацьдзеяння парушэнням парадку пропуску трафіку на сетках электрасувязі, і канкрэтызацыі правіл аказання паслуг электрасувязі была прынята дадзеная пастанова.

Змены, прынятыя ў пастанове, не закрануць добрапрыстойных абанентаў.

Правіламі аказання паслуг электрасувязі аператарам дадзена права прыпыняць і спыняць аказанне паслуг электрасувязі карыстальнікам, блакаваць трафік IP-тэлефаніі ў выпадку парушэння заканадаўства, а таксама дадзена права аператарам запытваць тлумачэнні ад абанента па пытаннях парушэння парадку выкарыстання выдзеленага яму абаненцкага нумара.

З пераліку адміністрацыйных працэдур для аператараў электрасувязі выключаецца плата пры рэгістрацыі канала сувязі, які забяспечвае перадачу сігналу электрасувязі паміж сеткавымі станцыямі і (або) вузламі.

Пастанова ўступае ў сілу з 18 верасня 2016 года.

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/news/25-08-2016-1067*